ПА СУТНАСЦІ

Адказваючы на заўвагу наконт таго, што мы «па дробязях ваюем», ён сказаў: «Навошта ствараць праблему ў сябе, калі ўвесь свет аб'яднаўся супраць нас? Супраць Беларусі, перадусім, і адзінага саюзніка Беларусі — расіян. І ўсё гэта лухта, што Лукашэнка на Захад сабраўся. Ды нікому на Захадзе Лукашэнка не патрэбны».

Пра санкцыі беларускі лідар адазваўся, што яны нават прынеслі карысць, бо навучылі трымацца: «Як бачыце, мы не загінулі. І ў тым ліку, дзякуючы вам».

Прэзідэнт прывёў у прыклад гандлёвыя войны. Па яго словах, Трамп разварушыў гэты мурашнік і перавярнуў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Ён расказаў, як пажартаваў Пуцін наконт праблем у гандлёвай арганізацыі, адзначыўшы, што зноў Лукашэнка выйграў. «Хто ў ЕАЭС не член СГА? — задаў пытанне Прэзідэнт. — Толькі Беларусь». Кіраўнік дзяржавы працягнуў, што Расія абяцала не ўступаць у СГА. Потым туды далучыўся і Казахстан, у арганізацыі і Арменія, і Кыргызстан. «Беларусь ужо на парозе ўступлення, але трэба разабрацца, куды мы збіраемся ўступіць».

«Вакол хаос. Для нас гэта шанц. Нам трэба зараз тут аб'яднацца, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.— Нам сваё шчасце шукаць тут».

Беларускі лідар сказаў, што дробныя праблемы ў двухбаковых адносінах не трэба ствараць. «Ну добра, вы не прададзіце нам пяць дадатковых мільярдаў кубоў газу, — выказаўся ён.— Куды вы дзенеце гэты прыродны газ? А вы ж не забывайце, што многія радовішчы нафты і газу асвойваліся зусім нядаўна беларусамі, расіянамі і ўкраінцамі разам».

У ІНТАРЭСАХ БЕЛАРУСАЎ І РАСІЯН

Чарговая сустрэча з Уладзімірам Пуціным плануецца 25 снежня. Аб гэтым Прэзідэнт заявіў, адказваючы на пытанне журналіста «Коммерсанта» Уладзіміра Салаўёва. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што, калі нас хочуць падзяліць на вобласці і «ўпіхнуць» у Расію, гэтага не будзе ніколі. «І калі такімі катэгорыямі кіраўніцтва Расіі мысліць — гэта на шкоду самой Расіі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, паведаміўшы, што заўсёды назірае за пагрозамі суверэнітэту дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што быў ініцыятарам падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Краіны паслядоўна ішлі да больш высокага ўзроўню супрацоўніцтва і прапісалі там нават тое, што нагадвала адзіную канстытуцыю.

«Потым я стаў нежаданым госцем у Расіі. Вы памятаеце гэта? Памятаеце. А чаму? А чаму вы не пайшлі на маю прапанову аб прыняцці канстытуцыйнага акта. Там дакладна было запісана, калі прыняць гэтую канстытуцыю. І ў гэтую канстытуцыю нешта было б з дагавора перанесена, а нешта новае было б прынята», — паведаміў беларускі лідар.

Прэзідэнт адзначыў, што прапаноўваў яшчэ шмат, але партнёры на гэта не пайшлі. «Таму што, калі мы зараз паставім на адзін узровень Беларусь і Расію ў дагаворы, у нас Татарстан і іншыя рэспублікі запатрабуюць, каб яны на гэтым узроўні былі», — паведаміў прычыну несупадзення інтарэсаў Аляксандр Лукашэнка.

Фота БелТА.

Потым краіны пачалі займацца іншымі пытаннямі інтэграцыі — роўнымі правамі, адмянілі межы. «Я больш ведаю, чаму спахапіліся пра гэты дагавор. Калі гэта ў імя аб'яднання народаў устала пытанне, калі гэта мэта сапраўдная і тыя, хто падымае сёння гэтыя пытанні, мусіруе і настойвае на іх, тады давайце абмяркоўваць», — падкрэсліў Прэзідэнт, каментуючы, чаму дагавор аб Саюзнай дзяржаве выклікаў шум і цікавасць у журналістаў.

«Калі развіваць праект Саюзнай дзяржавы, як модна казаць, гэта трэба рабіць годна. Можа пафасна скажу: толькі ў інтарэсах беларусаў і расіян», — запэўніў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што асабістае ў гэтым пытанні трэба пакінуць.

ЗАПРАШЭННЕ Ў ГРОЗНЫ І ПЫТАННЕ ПРА ЗБРОЮ

У размове з журналістам з Чачні Аляксандр Лукашэнка сказаў, што мае добрыя адносіны з Рамзанам Кадыравым, кіраўніком Чачэнскай Рэспублікі, і хацеў бы наведаць Грозны. Таксама Прэзідэнт сказаў, што можна дамовіцца яшчэ і пра наступныя крокі ў супрацоўніцтве. У прыватнасці ён вылучыў авечкагадоўлю, якая ў гэтым рэгіёне развіваецца добра. Беларусь, якая таксама плануе развіваць гэтую галіну, можа паглядзець на вопыт партнёраў.

Што да гандлю зброяй, Прэзідэнт падкрэсліў, што нават з улікам продажу «Паланэза» Беларусь не ўваходзіць у першую тройку краін, якія прадаюць зброю Азербайджану. Армянам не варта бачыць у нашай краіне апанента. Для Беларусі важныя добрыя адносіны з абедзвюма дзяржавамі. Наконт Нагорнага Карабаха ў Аляксандра Лукашэнкі пазіцыя адна: пытанне неабходна вырашаць кіраўнікам Арменіі і Азербайджана ўдваіх, без знешняга ўплыву.

ЯК РЭАГАВАЦЬ НА ФЭЙКІ

Першы намеснік галоўнага рэдактара газеты «Вечерняя Москва» Аляксей Бялянчаў пацікавіўся, наколькі вялікі паток фэйкавых навін у Беларусі. «Якая тут дынаміка і як вы рэагуеце?» — спытаў журналіст. Па яго словах, згодна з дакладам амерыканскай сацыялагічнай кампаніі, на пачатак 2018 года сем з дзесяці грамадзян ЗША не давяралі інфармацыі з сацыяльных сетак, і менавіта там баяліся несапраўдных навін, а ўзровень даверу да традыцыйнай журналістыкі ўзрос да 59 % сярод апытаных. Брытанскія сацыёлагі назвалі нашы дні часам эпідэміі фэйкавых навін: 75 % іх рэспандэнтаў давяраюць навінам газет і часопісаў, 69 % — сайтам традыцыйных СМІ, 57 % — інфармацыі кругласутачных навінавых тэлеканалаў. У той жа час 53 % давяраюць СМІ, якія маюць толькі электронную версію, і толькі 37 % — інфармацыі сацыяльных сетак, дадаў Аляксей Бялянчаў.

«Распаўсюджвальнікаў фэйкаў хапае не толькі ў інтэрнэце, — пагадзіўся Аляксандр Лукашэнка. — Я больш спакойна рэагую на фэйкі ў інтэрнэце, чым калі гэта з'яўляецца ў салідным выданні, якое можна патрымаць у руках. Можа, я надта кансерватыўны, я савецкі чалавек, таму ў мяне такія адносіны да кніг і газет. Я інтэрнэтам рэдка карыстаюся, калі шчыра».

Наўрад ці можна знайсці вінаватага, калі нейкі бруд з'яўляецца ў сусветным сецiве, выказаў сумненні кіраўнік дзяржавы. Каб растлумачыць сваю рэакцыю на гэта, ён згадаў даўнюю параду колішняга Прэзідэнта Расіі Барыса Ельцына не звяртаць увагу на глупства і падман у СМІ.

«З цягам часу я стаў больш спакойна рэагаваць на нейкія фэйкі, тым больш ёсць такія, што прыносяць карысць. Часам такое глупства выходзіць, што я кажу прэс-сакратару: трэба народу расказаць, гэта будзе на карысць, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. — А галоўнае для мяне — паглядзець, каму гэта трэба».

Прэзідэнт Беларусі заклікаў журналістаў, у тым ліку аўтараў і распаўсюджвальнікаў фэйкавых навін, да прамой і адкрытай размовы. Акрамя таго, ён адзначыў, што давер да традыцыйных СМІ расце, і разам з тым прызнаў вельмі важную ролю інтэрнэту.

ПРА «ВАЙНУ З ПОМНІКАМІ» І ЧЫСЦІНЮ НА ВУЛІЦАХ

Прадстаўнік інфармацыйнага агенцтва «Ветеранские вести» папрасіў дапамагчы ветэрану адной з брыгад, якая ваявала на тэрыторыі Беларусі, ураджэнцы Магілёўскай вобласці Леакадзіі Коўтун, якая зараз засталася без належнага жылля ў Душанбэ. Прэзідэнт абяцаў, што рэакцыя на гэта будзе, на працягу тыдня з ёю звяжуцца.

Гаворачы пра нашу агульную памяць, кіраўнік дзяржавы раскрытыкаваў «вайну з помнікамі», якая мае быць, напрыклад, у Польшчы. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі захаваны старыя назвы вуліц і помнікі.

Гэта магчыма пабачыць і па раёнах сталіцы: Партызанскі, Маскоўскі... «Трэба шматбакова ацэньваць гэта і не зносіць помнікі. Хай яны стаяць. Нашы ўнукі, праўнукі прыйдуць і спытаюць, хто быў такі. Хоць у інтэрнэце ці дзе паглядзяць пра гэтага чалавека», — лічыць Прэзідэнт. У Беларусі кожны помнік даглядаюць, у тым ліку школьнікі.

Аляксандр Лукшэнка таксама дадаў, што, калі чытае пра тое, што Мінск чысты горад, ведае, як праблема смецця вырашаецца. У нас кожны лапік сталіцы замацаваны ці за прадпрыемствам, ці за школай. «І гэта ў мяне на кантролі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Таму і Мінск падтрымліваецца ў належным стане.

ТРЭБА ЎМЕЦЬ СЛУХАЦЬ ЛЮДЗЕЙ

Прэзідэнта Беларусі чарговы раз спыталі наконт смяротнага пакарання. Ён зноў адказаў, што гэта самыя цяжкія дакументы, якія яму даводзіцца падпісваць. Кіраўнік дзяржавы заўсёды просіць азнаёміцца з матэрыяламі крымінальнай справы. Кадры, дзеліцца Аляксандр Лукашэнка, звычайна жудасныя. За ўвесь час было толькі два чалавекі, якіх ён памілаваў.

Ён адзначыў, што некаторыя прадстаўнікі Захаду лічаць, нібыта пытанне смяротнага пакарання не павінна выносіцца на рэферэндум. «Яны прывыклі гаварыць, што гэта пытанне не для народа. А я лічу — для народа. Ну, як бы я ні лічыў, у нас прайшоў рэферэндум», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

У Беларусі адбыўся рэферэндум, на якім большасць грамадзян выказалася супраць адмены смяротнага пакарання. «У нас прайшоў рэферэндум. Адмяніць смяротнае пакаранне не магу», — паставіў кропку Аляксандр Лукашэнка.

Прадстаўнік газеты «Новгородские ведомости» расказаў, што падчас прэс-тура расійскія журналісты наведалі Парк высокіх тэхналогій, і запытаў, як Аляксандр Лукашэнка ацэньвае прарыўныя крокі краіны ў IT.

Прэзідэнт растлумачыў, што прыкладна 15 гадоў таму падпісаў указ аб ПВТ. Ішлі ад жыцця: заказы з-за мяжы паступалі для нашых праграмістаў, таму неабходна было даць ім месца і стварыць умовы для работы.

Законы, якія сталі прарыўнымі, падрыхтавалі, і яны трапілі ў цэль. «Я проста падтрымаў гэтую тэндэнцыю, як усюды ў нас, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Усё ідзе ад людзей. Трэба проста ўмець слухаць».

Аднак пры гэтым ён дадаў, што чалавека каля станка ніхто не заменіць. IT можа дапамагчы, але замяніць — не.

«УТЫЛІЗАВАЦЬ БЯЗДОМНЫХ ЖЫВЁЛ — ГЭТА БЯЗЛАДДЗЕ»

Журналістка партала storm24.media Рэспублікі Саха задала пытанне пра абарону жывёл, гэту тэму яна пачынала яшчэ два гады таму на папярэдняй сустрэчы Прэзідэнта з расійскімі журналістамі. На жаль, зараз сітуацыі і ў Расіі, і ў Беларусі падобныя, бо існуе практыка «ўсыпалак», куды сабакі і каты трапляюць, як той казаў, з білетам у адзін канец. Ці збіраецца Беларусь вырашаць пытанне безнаглядных жывёл больш гуманным спосабам?

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў за тое, што паднялі гэта пытанне. У Прэзідэнта, дарэчы, жыве тры каты і два сабакі. «У мяне да жывёл увогуле трапяткія адносіны. Мабыць, больш, чым у вас», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў і выпадак з уласнага жыцця, калі прыйшлося ўсыпіць яго самую любімую аўчарку пасля інсульту. «Але потым мне расказалі, як пакутуюць жывёлы, калі іх усыпляюць. У мяне пасля гэтага загінула два сабакі ад старасці. Яны паміралі самі. Яны паміралі, я сам пакутаваў, гледзячы на іх, бо сабака — гэта ж тваё дзіця, гэта член тваёй сям'і», — сказаў Прэзідэнт.

«Але ёсць іншыя выпадкі, калі нармальныя здаровыя жывёлы, але яны кінутыя. Іх усыпляюць, утылізуюць. Гэта бязладдзе. Але бязладдзе наша з вамі. Я, як вясковы чалавек, ведаю, адкуль з'яўляюцца бяздомныя кошкі і бяздомныя сабакі. Гэта ад нас. Гэта мы іх выкідваем на вуліцу», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка паабяцаў разабрацца з гэтай праблемай у Мінску, а таксама нагадаў пра пісьмо Брыжыт Бардо на гэтую ж тэму і дадаў, што рыхтуе для яе адказ. Гэта вельмі важная тэма, сказаў кіраўнік дзяржавы.

УБАЧЫЦЬ ГАЛОЎНАЕ

На сустрэчы таксама былі закранутыя пытанні запускаў новых міратворчых працэсаў, ушанавання памяці савецкага дзяржаўнага дзеяча Андрэя Грамыкі, павышэння ролі экспертаў у фармуляванні агульных пазіцый, філасофскага бачання ідэальнай будучыні Беларусі і іншыя.

Напрыканцы размовы Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Я не збіраюся рабіць нейкае заключэнне. Самае галоўнае заключэнне — гэта ваш настрой. Калі я дастукаўся да вас, да кожнага, пачынаючы ад Ноўгарада, Уладзіміра, заканчваючы «Камерсантам», і вы зразумелі мяне. Ацэньвайце як хочаце — гэта ваша справа, гэта ў сілу вашага становішча, адукацыі, залежнасці ад некага або незалежнасці. Я вельмі рады, што вы прыехалі. Кпінаў хапае на гэту тэму: вось там, прыехалі такія-сякія... Нармальныя прыехалі расіяне, якія жывуць на месцы, у глыбінцы, і якія ведаюць жыццё. Таму для мяне сустрэча з вамі — магчымасць адчуць і маю Расію. Я па вас ацэньваю, якая сітуацыя ў Расіі, і добра, што запрасілі вучоных, экспертаў. Магчыма, я не ўсім спадабаўся, але майце на ўвазе: усё гэта было экспромтам. І зрабіце скідку на тое, што я чалавек эмацыянальны і залішне, магчыма, шчыры, магчыма недзе кагосьці зачапіў, пакрыўдзіў. Не гэта галоўнае. Давайце будзем глядзець у корань, будзем бачыць галоўнае. Я вельмі хачу, каб з нашай амаль чатырохгадзіннай гутаркі мы атрымалі сутнасць, якая наблізіць нас: чачэнцаў, інгушоў, кабардзінцаў, рускіх, яўрэяў, палякаў, беларусаў, украінцаў. Не трэба ваяваць. Добра, калі мы сябруем і калі ў нас усё нармальна».

Надзея АНІСОВІЧ,
Марыя ДАДАЛКА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.